# Гісторыя ў здымках




Вераніка ЯХНО

**У аддзеле мастацтва Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага адбылося адкрыццё выставы «Вайна. Перамога. Памяць». Яна прысвечана 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.**

Выстава арганізавана ў рамках творчага праекта «Дакрануцца да гісторыі» і з'яўляецца восьмай па ліку. На ёй прадстаўлена больш за 500 экспанатаў. Пераважная большасць – з прыватнай калекцыі гродзенскага краязнаўцы, журналіста, калекцыянера Аляксандра Сявенкі.

Сярод прадстаўленых каштоўнасцей выставы – фотаздымкі салдат і афіцэраў даваенных, ваенных і першых пасляваенных гадоў, газеты («Советская Белоруссия», «Известия» і «Правда» за 9 мая 1945 года, газета «Красноармейская правда» з перадавіцай «Берлин взят!», нямецкая газета, якая датуецца 13.07.1944 г., партызанскія газеты), часопісы ваеннага часу. Немалаважную каштоўнасць складаюць пасляваенныя і сучасныя кнігі, якія прысвечаны розным этапам вайны, у прыватнасці, першым абаронным баям на Гродзеншчыне, перыяду нямецкай акупацыі і вызваленню г. Гродна.

На выставе прадстаўлена вялікая колькасць унікальных дакументаў. Асобае месца займаюць прадметы савецкага і нямецкага салдацкага побыту. Маркі, значкі, узнагароды, медалі – усё тое, што прыцягвае ўвагу. Можна ўбачыць і фарфоравыя фігуркі воінаў савецкай арміі і матросаў. 21 фігурка належыць гродзенцу Сяргею Зыбелю.

«Фотаздымкі, якія прадстаўлены на выставе, я збіраў шмат гадоў. З іх на нас глядзяць мужныя, адважныя людзі, як мужчыны, так і жанчыны. Часам шкадуеш, што не ведаў іх асабіста», – падкрэслівае Аляксандр Сявенка. Фотаздымкі лётчыкаў, ваеннаслужачых у будзёнаўках, афіцэраў з жонкамі (здымак быў зроблены пры сустрэчы Новага 1941-га года). Як адзначае гродзенскі краязнаўца, найбольшую каштоўнасць маюць пасляваенныя фотаздымкі жывых удзельнікаў абароны Брэсцкай крэпасці разам з афіцэрамі Савецкай арміі. Там ёсць і аўтографы герояў 1941 года.

Захаваўся і здымак групы дзяцей у сёлетнім гарадскім парку імя Жылібера, які быў зроблены ў 1943 годзе. У дзетак можна ўбачыць нямецкі ваенны галаўны ўбор і савецкую пілотку. Прысутнічаюць у экспазіцыі фотаздымкі растралянай немцамі яўрэйскай сям'і, воінаў 30-й (55-й) гвардзейскай Іркуцка-Пінскай стралковай дывізіі. Сярод іх – здымак камандзіра дывізіі генерала Турчынскага, іншых афіцэраў дывізіі, ваенных урачоў гэтага злучэння: Васілія Гарыенкі, Елізаветы Сяргеевай. «У пасляваенныя гады яны былі знакамітымі ўрачамі нашага гораду. Падпалкоўнік медслужбы Гарыенка пасля дэмабілізацыі ў адзін з перыядаў свайго жыцця быў галоўным урачом Гродзенскай абласной бальніцы, шмат чаго зрабіў для яе развіцця», – паведамляе Аляксандр Сявенка.

У экпазіцыі выставы прадстаўлены і дакументы перыяда нямецкай акупацыі, узнагародныя дакументы савецкіх воінаў.

Вялікая Айчынная вайна ніколі не будзе забыта. Аб гэтым і гавораць усе тыя каштоўныя знаходкі выставы «Вайна. Перамога. Памяць», у якіх адлюстравана жудасная ваенная гісторыя.